# ПРОСТЫЯ ХЛОПЦЫ З МАГІЛЁЎШЧЫНЫ



# Сяргей ЛУПІКАЎ

Ён нарадзіўся ў кастрычніку 1923 года ў вёсцы Бяседавічы Хоцімскага раёна. Яго бацькі былі сялянамі; пасля заканчэння школы Сяргей Агафонавіч таксама пайшоў працаваць у мясцовы калгас. Амаль два гады правёў пад нямецкай акупацыяй.

Вайсковы шлях Сяргея Лупікава пачаўся ў 20 гадоў — у кастрычніку 1943 года, калі Чырвоная Армія вызваліла Хоцімшчыну. Ваяваў ён у складзе 1223-га стралковага палка 369-й стралковай дывізіі 50-й арміі ў складзе 2-га Беларускага фронту.

...Свой першы ордэн Славы III ступені ён здабыў ужо падчас баёў на тэрыторыі Польшчы. У жніўні 1944 года лінія фронту праходзіла ўжо крыху на захад ад Беластока. У той час сяржант Лупікаў камандаваў аддзяленнем узвода пешай разведкі. Ён атрымаў заданне разведаць агнявую сістэму праціўніка паблізу вёскі Асавец. З ім аддзяленне справілася на «выдатна». Больш за тое, назад салдаты вярнуліся з сямю палоннымі немцамі, яшчэ чатыры былі забіты падчас уварвання ў траншэю.

У лютым 1945 года зацятыя баі ішлі на напрамку Лодзь—Гданьск. Камандаванне арміі паставіла задачу — авалодаць вёскай Альтхаўзен. Бой за яе ішоў ажно тры дні. Падчас адной з перастрэлак моцна параніла камандзіра ўзвода. Яго замяніў сяржант Лупікаў. Немцы панеслі адчувальны ўрон — было знішчана каля трох дзясяткаў гітлераўцаў. Яшчэ 172 здаліся ў палон. Сярод іх былі і афіцэры. Узвод здолеў вывесці са строю 2 гарматы і 4 кулямёты. Загадам па 70-й арміі Сяргей Лупікаў быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

Разам са сваім узводам сяржант вельмі адзначыўся падчас узяцця польскага горада Гдыні. У ноч на 27 сакавіка 1945 года яны разведалі чатыры пераправы цераз раку Ісача, дзякуючы якім савецкія часці змаглі ўварвацца ў населены пункт. Больш за тое, яго ўзвод захапіў авіяцыйны завод, знішчыў трыццаць аднаго і ўзяў у палон паўсотні немцаў. Гэтыя ўчынкі сталі падставай для прадстаўлення сяржанта Лупікава Сяргея Агафонавіча да ордэна Славы I ступені. Дакумент падпісаў камандуючы 2-м Беларускім фронтам Маршал Савецкага Саюза Канстанцін Ракасоўскі. Поўным кавалерам ордэна Славы Сяргей Лупікаў стаў ужо пасля Перамогі — 29 чэрвеня 1945 года.

Пасля вайны ён доўгі час жыў і працаваў у Магілёве, у адным з будаўнічых трэстаў. Памёр 31 сакавіка 1995 года.

**Шкленнік, В.** Простыя хлопцы з Магілёўшчыны / Валер’ян Шкленнік // Звязда. — 2020. — 11 мая. — С. 9.